№ 6 (148). Rok XI. „SZLACH MOŁADZI“ Wilno, 25.III.1939.



ШЛЯХ МОЛАДЗІ
ŚLACH MOŁADZI
ІЛЮСТРАВАНЫ ЧАСАПІС БЕЛАРУСКАЙ МОЛАДЗІ

№ 6 (148). Вільня, 25 Сакавіка 1939 г. Год XI.

10 ГОД ПРАЦЫ „ШЛЯХУ МОЛАДЗІ“

10 год так мінула хутка, што аж ня хочацца верыць, што гэтулькі ўжо прайшло часу ад выхаду ў сьвет першага нумару «Шляху Моладзі». Сяньня, калі глядзім на ўвесь гэты час працы, здаецца, што прайшоў ён міла, прыемна і зусім забываемся аб тых усіх нявыгодах, якія так часта здараліся. Фактычна сам ужо пачатак — першы нумар «Шляху Моладзі» — паўставаў у нябывала цяжкіх абставінах, бо ніхто з сяброў Рэдакцыйнае Калегіі абсалютна ня быў прыгатаваны ані да працы выдавецкае, ані да рэдакцыйнае. І тут мусім падчыркнуць вялікую заслугу кс. Адама Станкевіча, як беларускага дзеяча і ўласьніка Беларускае Друкарні ім. Фр. Скарыны. Ён нам пазволіў бясплатна карыстацца друкарскімі прыладамі і памагаў рабіць першыя крокі ў рэдакцыйнай працы, за што шчыра Яму ўдзячныя.

Паступова, пры падтрыманьні шырэйшых кругоў беларускае моладзі і дзякуючы стараньням самых закладчыкаў, «Шлях Моладзі» рос. Праца выдавецтва і рэдакцыі ў сэнсе фаховым ставалася лягчэйшай. Пачалі аднак расьці новыя нявыгоды ў меру таго, як расло значэньне «Шляху Моладзі» і як ставіў ён сабе штораз большыя і вышэйшыя беларускія імкненьні. І так: канфіскаты, суды, забароны, ды напады ў ў прэсе крайняе лявіцы і правіцы, якія да прыемнасьцяў залічаць ня будзем.

Адным з найгалаўнейшых імкненьняў «Шляху Моладзі» было між іншым стварэньне арганізацыі беларускае моладзі, якой быў-бы ён органам. Дзеля таго ў 1929 годзе быў апрацаваны адпаведны статут і пастаноўлена сарганізаваць Таварыства Беларускае Моладзі «Будучыня» ў Вільні. Статут быў шырокі і ў межах яго можна было-б праводзіць сапраўды вялікую культурную і асьветную працу сярод беларускае моладзі, але нажаль ані Віленскае Ваяводзтва, ані Міністэрства Унутраных Спраў не згадзілася яго зацьвердзіць. Адказ Міністэрства Унутр. Спр. з дн. 23.II.1932 № V 1433/30 пакінуў нашу просьбу «bez uwzględnienia», не падаючы прычыны. Адмова гэта ня спыніла нашых імкненьняў да стварэньня арганізацыі беларускае моладзі і ў 1937 г. былі ўзноўлены стараньні стварыць гэтым разам Саюз Беларускае Моладзі, аднак Віленскае Гарадзкое Стараства не дало ўжо нават дазволу на арганізацыйнае сабраньне...

Маладыя, гарачыя, парывістыя і часта непрактычныя пёры ўваходзілі няраз у канфлікт з цэнзарам, а ў выніку гэтага мелі мы 14 канфіскатаў, а пасьля і суды. Кожная такая канфіската «Шляху Моладзі» прыносіць вялікія, перад усім матарыяльныя страты. Суд аднак, хоць так-жа прыносіць кошты, але дасюль пакараў нас праўамоцна толькі адзін раз.

Ня гледзячы на няспрыяючыя абставіны, «Шлях Моладзі» разьвіваўся, выдаў 4 вельмі карысныя кніжкі («Палітычныя кірункі ў мінуўшчыне і сучаснасьці», «Да гісторыі беларускага палітычнага вызваленьня», «Літаратурная і грамадзкая дзейнасьць А. Пашкевічанкі (Цёткі)» і «Rady chvorym i zdarovym», kn. III. (Umovy i zahady nieabchodnyja dla zdaroŭja) і гуртаваў каля сябе штораз большыя жывыя маладняцкія беларускія сілы, а ў іх ліку ўвесь бадай літаратурны маладняк. Спрыяла гэтаму шырокая плятформа, на якой стаў «Шлях Моладзі» і мэты, якім пасьвяціў свае бачыны. Мэтай нашага часапісу было і ёсьць ськіваваньне беларускае моладзі на правільны нацыянальны беларускі шлях, абзнаямленьне яе з беларускай гісторыяй, географіяй, літаратурай, народным творствам, абарона інтарэсаў Беларускага Народу, культурная, асьветная і ўзгадаваўчая праца, да каторай запрошаны ўсе, каму дарагая беларуская справа. І сапраўды, на бачынах «Шл. Мол.» друкаваліся артыкулы Беларусаў розных паглядаў і палітычных кірункаў, якіх лучыла любоў да свайго краю і Беларускага Народу. Такі збор людзей ня значыць аднак, што «Шлях Моладзі» ёсьць нечым бязхрыбетным і ня мае свае ідэолёгіі. Не! «Шлях Моладзі» апіраючыся на хрысьціянскай этыцы выпрацаваў сабе сваю ідэолёгію, апёртую на беларускай традыцыі, народных жаданьнях і імкненьнях. Галоўнымі асновамі нашае ідэолёгіі ёсьць здаровы, творчы беларускі нацыяналізм і высокія дэмакратычныя прынцыпы: свабода, роўнасьць і братэрства. Шырэй аб гэтым пісалі мы ў № 11(127) «Шл. Мол.», 5.V.1938, а так-жа ў іншых нумарох, а ў гэтым вельмі трапна характарызуе нашую ідэолёгію Высока Паважаны Кс. Адам Станкевіч у сваім прывітаньні, дзеля таго ня будзем над ідэолёгіяй больш затрымлівацца, а зьвернем яшчэ ўвагу на зьмест «Шляху Моладзі».

Вось-жа дзеля вышэй паказаных мэтаў стараемся ў «Шляху Моладзі» даваць артыкулы

з галінаў культурна-асьветнае, узгадаваўчае, а таксама аб справах, якія зьяўляюцца для Беларускага Народу і моладзі вельмі актуальнымі, ды ў меру магчымасьці інфармаваць аб падзеях у краю і ўсім сьвеце. Трэба сказаць, што чытачы нашы цікавяцца часапісам, трымаюць з ім кантакт і выражаюць свае пажаданьні, што для рэдакцыі ёсьць ня толькі вялікай помачай, але і пацехай. — Адны хацелі-б, каб было ў «Шл. Моладзі» больш матарыялу з галіны культурна-асьветнае ці мо' лепш сказаць—з галіны навукова-папулярнай, другія — каб больш інфармацыяў, палітычных аглядаў і г. д. Ізноўжа літаратурны маладняк, а так-жа і старэйшыя беларускія літаратары хочуць, каб больш месца пасьвячаць для вершаў і прозы. Студэнты, якія заўсёды былі ў радох нашых супрацоўнікаў, неабходна патрабуюць мець сваю сталую бел. студ. трыбуну. Усе дамаганьні зусім правільныя. Патрэба асьветы, асабліва для моладзі, вялізарная. Ацначасна вёска наша ня мае свае багатае беларускае прэсы, а цікавіцца падзеямі, якія цяпер проста трасуць сьветам. Трэба так-жа даць магчымасьць разьвівацца літаратурнаму маладняку і запраўляцца да грамадзкае працы беларускаму студэнцтву. Мы хацелі-б усіх задаволіць. Ацаняючы значэньне літаратуры і патрэбу бел. прозы ладзілі адумысловы літаратурны конкурс. Ведаючы-ж ролю, якую адыгрывае ў жыцьці маладога пакаленьня і агулам народу студэнцтва, супольна з бел. студэнтамі пачалі выдаваць студэнцкі дадатак «Šlach Biełaruskaha Studenta». Давалі-б больш артыкулаў навукова - папулярных і інфармацыяў, але бачыны часапісу за малыя і пакульшто ня можам іх павялічыць. Але робіцца і ў гэтым кірунку стараньні. Група беларускае інтэлігенцыі, а так-жа і выдаўцы «Шляху Моладзі» стараюцца, каб сыстэматычна выдаваць брашуры характару навукова-папулярнага. Гэта быў-бы ўжо вялікі поступ у галіне асьветнай. Але, як для выдавецтва названых брашураў, так і для павялічэньня «Шляху Моладзі», каб мог ён яшчэ лепш спаўняць сваю ролю, патрэбнае агульнае падтрыманьне моладзі і народу. Для вялікіх агульна-народных справаў патрэбны агульныя натугі і поступ да штораз больш ых асягненьняў. Праўда, «Шлях Моладзі» зрабіў поступ і выходзіць ужо нават не адзін раз, як на пачатку свайго існаваньня, а два разы ў месяц, але гэтага мала. Мы бачым, што вёска наша і народ далей жыве ў цяжкіх варунках, сярод моладзі шмат яшчэ ёсьць цемнаты, дзічы і пануе нядоля. Дзеля таго ўсім, у каго гарыць сэрца любоўю да свайго краю і народу, трэба штораз больш энэргічна і ахвярна працаваць над паляпшэньнем яго долі — маральнае і матарыяльнае.

Я. Н.



ПРЫВІТАНЬНЕ

„Шлях Моладзі" родны вітаю,
Яму шлю гарачы прывет!
Да мэты аднэй я шагаю
Бадзёра за ім я усьлед.

Як прыдзеш пад нашыя стрэхі,—
Наперад ступаем сьмялей,
З Табою шмат радасьці, ўцехі,
З Табою жыцьцё весялей.

Мы—моладзь, мы—сіла народу,
Ідзём па „Шляху Маладых,"
Да лепшае, сьветлае, долі,
Да шчасьця свайго і ўсіх.

Са шляху ня ўступім нікому,
Ня зьвернем ні й бок ні назад.
Шагаем к быцьцю ўжо другому,
Тварцы мы жыцьця, авангард.

Мы пэўны сваей перамогі...
Гэй, моладзь, ня знай перапон!
Прад намі шырокі дарогі
Да новых і сонечных дзён.

„Шлях Моладзі" родны вітаю.
Ад гора вітаю і бед —
Ад вёскі Яму пасылаю,
Гарачы і шчыры прывет!

Янка Бунтар

Грамадзяне! Памятайце аб беларускай моладзі і прысылайце ахвяры на дапамаговы фонд беларускім незаможным а здольным вучням і студэнтам на адрыс: Red. „Šlachu Moładzi" — Wilno, Zavalnaja vul. 1—2.

Памятуйма, што свая беларуская інтэлігенцыя найлепш дбае аб дабро для свайго Беларускага Народу!

Граніца

Карагалі мы дома апошнія дні. Крыху яшчэ працавалі, але ўжо зьбіраліся ў дарогу. Было нас трох. Часта зьбіраліся ў Белавежскай Пушчы і абгаварвалі пляны. Была раньняя беларуская восень. На пашчаных палосках падбелавежскіх вёсак разсядаліся бабы. Вольна снуем туды-сюды, шукаем пад кустамі грыбоў. Аднак гэта толькі для вока, бо аб другім думаем.

У канцы жніўня плян дасьпеў — ідзём. Дома ніхто нічога ня знае. Дзядзька перад выездам разьвітаецца—нармальна, як перад выездам на работу:— „Будзь здароў сынок, ідзі шчасьліва, хай цябе Бог сьцеражэ." Толькі матка штосьці прадчувае. Сьпіць неспакойна, тужлівей глядзіць на мяне, ходзіць як не свая. Калі разьвітаемся, моцна плача: „Не пабачу цябе больш, чуе маё сэрца, не пабачу." Успакойваю, як магу. Накідаю на руку плашч, бяру незялічкі пакунак і—бывай вёска, бывай тая, аб якой ночы ня спаў, думаў.

Першага верасьня пад вечар сядзім у цягніку. Стукочуць колы, вагончыкі хіляюцца ўва ўсе бакі. Аддаляецца ад роднае старана. На другі дзень пад вечар апынуліся ў пaыграгічным мястэчку. Трэба ўчуцца ў атмасфэру прыгранічча. Пайшлі паасобку ў мястэчка, снуем, прыглядаемся. Заходжу ў жалезную краму, купляю абцугі на рэзаньне дроту. Крамнік паглядзеў на мяне — нічога не сказаў, дагадаўся. Днём разглядаліся па полі ў ваколіцах мястэчка, ночы прасыналі абы дзе. Знаёміліся з мясцовасьцю. Часта-густа натыкаліся на пагранічнікаў, якіх абыходзілі.

Урэшце падабралі месячную ноч і рушылі. Кіраваліся на ўсход па зорах і месяцы. Абмануў нас месяц. Пакуль мы наставіўшы вушы брылі па полі, падыйшоў ён высока. Зьбіліся мы з дарогі. Ледзь толькі адышлі ад мястэчка, наткнуліся на хутарную асаду, ды дагаго з сабакамі. Спушчаныя нанач з ланцугоў, скочылі яны за намі. Зьнекуль вырзаўся і чалавек на кані. Падабраўшы вышэй ногі, кінуліся мы ў бок, да бліз-


СЫМБАЛІ БЕЛАРУСКАЕ СТОЙКАСЬЦІ

(У 75-тыя ўгодкі сьмерці Кастуся Каліноўскага і 60-тыя ўгодкі нарадзінаў Пётры Крэчэўскага)

Пераглядаючы прозьвішчы, жыцьцё і дзейнасьць [вялікіх і заслужаных для беларускага



К. Каліноўскі



П. Крэчэўскі

адраджэньня змагароў, напатыкаем на дзіўнае падабенства да сябе Кастуся Каліноўскага і Пётры Крэчэўскага. Слаўныя гэтыя постаці жылі і дзеілі ў розных часох, аднак служылі аднэй і тэй самай беларускай адраджэнскай ідэі і былі ў вельмі многім да сябе падобныя.

Кастусь Каліноўскі — паўстанец, званы чырвоным дыктатарам Беларусі і Літвы, — аж да самай сьмерці на царскай шыбеніцы, колькі меў сілы, з поўным адданем працаваў для дабра Беларускага Народу. Будзіў яго сваім бел. часапісам „Mužyckaja Praŭda", будзіў яго жывым словам да лепшага, сьвятлейшага жыцьця. А калі апынуўся ў вязьніцы, ня здрадзіў беларускае ідэі, міма вялікіх намаганьняў царскіх прыслужнікаў, і ўсьцяж памятаваў аб сваім народзе пішучы яму лісты з пад шыбеніцы, у якіх казаў:

Беларуска зямелька, галубка мая!
Гдзеж падзелася шчасьце і доля Твая?...
Бывай здаровы, даражэнькі Народзе!
Жыві ў шчасьці, жыві у свабодзе

кага лесу. А тут як на бяду—вузноў хата, хата аб'ежчыка. Трэба было абягаць. Віхрам упятаем у лес і кіруемся ў сярэдзіну. Сабакі асталіся. Умеру, як мы заглыбляліся ўлес, галасы іх ціхлі. Трохі адпачыўшы, ськіраваліся мы на бераг і пайшлі высьцерагаючыся людзей. Ноч была месячная. Кожны куст даваў цені, а нам здавалася, што гэта людзі. Дайшлі да залому лесу. Напеpадзе было поле, пасьля нявысокі лес, а ў ім блішчэла будыніна з бляшанай страхой.

— О, гэта ўжо граніца. Напэўна стражніца пагранічнікаў. Трэба асьцерагацца.

Заглыбіліся назад у лес і пачалі абходзіць. Раптам перад вачыма просінь неба і канец лесу. Чуем бразг жалеза. Хутка падаемся назад і лажымся пад кусты ды слухаем. Набліжаюцца галасы. Думалі—затрымаюцца на краю лесу. Не, ідуць далей. Проста на нас. Зрываецца позна, наробім шуму. Што будзе, то будзе— ляжым. Прайшлі міма нас, ледзьледзь не зачапіўшы ног. Пазналі мы іх,—сяляне на начлезе. Згубілі коні. Шукалі. Пачакаўшы мінут 10 выбіраемся з лесу. На полі спатыкаем маладога селяніна. Пытаем пра мясцовасьць, пра граніцу, дзе і як. Баіцца, маўчыць. Трэба самім шукаць. Узбрылі на балота. Мокра. Што далей, тым больш грозна. Ногі да кален мокрыя, ісьці цяжка. На бяду дабрылі да нейкай рэчкі. Перайсьці нельга. Ідзём уздоўж берагу, шукаем праходу, можа звузіцца. Урэшце перайшлі. У балота назад лезьці баімся. Хто ведае, якое яно і дзе канчаецца. Перад вачыма нешта цямнее. Прыбліжаемся — сад, аграмадны сад. Значыць — двор. Ня знойдзем прыпынку. Абмінаем яго, узыходзім на пасьбішча. У паветры чуць раніцай. Пачынаецца разсьвет. Трэба разлажыцца на днёўку. На пасьбішчы небясьпечна, яшчэ знойдуць. На кругазоры віднеецца млын. Можа туды? — Не, не, таксама небясьпечна. Лазячы так, знаходзім бульбу. Ня доўга думаючы, кладзёмся ў разоры. Папалі недалёка дарогі.

Узыйшло сонца. З вёскі едуць і йдуць людзі. Ледзь падняць

І часам спамяні пра „Яську" Твайго.
А калі слова пяройдзе у дзела,
Тады за працу станавіся сьмела,
Бо адно з працай у грамадзе згодна
Даждэешся, Народзе, старасьці
свабодна...

З гэтага ўжо відаць, як вялікім патрыётам і ідэалістам быў Каліноўскі. Быў гэта палітык, ваяка, культурнік, паэт перапоўнены гарачай любоўю да свае Бацькаўшчыны Беларусі, справу адраджэньня і самастойнага існаваньня каторае прадстаўляў сабе зусім рэальна ўжо ў 1862 г., калі Беларускі Народ сапраўды спаў быццам непрабудны сном, а ўсеўладна панавалі над нашай краінай чужынцы.

Падобнай верай, ахвярнасьцяй і стойкасьцяй адзначаўся і Пётра Крэчэўскі — Старшыня Рады Беларускае Народнае Рэспублікі, — каторы стойка бараніў самастойнасьці Беларусі і Вялікага Акту 25-га Сакавіка 1918 г., якім абвешчана Беларусь Незалежнай. Яму, падобна як і Каліноўскаму, сільныя гэтага сьвету сулілі павабныя прапазыкі, каб толькі ён прычыніўся да ліквідацыі незалежніцкае беларускае думкі. Хацелася гэтага асабліва камуністам, аднак П. Крэчэўскі, ня гледзячы на тое, што бальшавікі зьліквідавалі Беларускую Народную Рэспубліку і што жыў горкім эмігранцкім хлебам, не пайшоў на здраду. Ён стойка дзяржаў незалежніцкі сьцяг да сьмерці, каторая забрала яго ў 1928 г.

П. Крэчэўскі, як прыстоіла галоўнаму кіраўніку Беларускага Ураду, ставіў справу самастойнага існаваньня Беларусі ўва ўсей яе шырыні. Сьведчыць аб гэтым добра зборнік «Замежная Беларусь», выданы ў Празе Чэскай у 1926 г., у каторым П. Крэчэўскі зьмясьціў свае працы, матарыялы і дакумэнты, з якіх відаць, як сапраўды ўсестароньня прадстаўляў магчымасьці і патрэбу існаваньня незалежнай Беларусі, а таксама — як усестароньня бараніў яе на міжнародным грунце, між іншым у сваім Мэморандум у Лігу Народаў. П. Крэчэўскі, апіраючы правы Беларусаў да самастойнага гаспадарственнага жыцьця на ідэі самастанаўленьня народаў, на спэцыфічнасьці Беларусі ў тэрыторыяльным і нацыяналным адношаньні, на жаданьнях і волі Беларускага Народу і ягонай сьветлай традыцыі гаспадарственнага незалежнага жыцьця ў сівой мінуўшчыне, даказаў такжа магчымасьць самастойнага жыцьця Беларусі ў сэнсе эканамічным. Між іншым, П. К. сьцьвердзіў, што да ўсясьветнае вайны што-год з Беларусі вывожана было заграніцу розных тавараў на суму каля 70 мільёнаў рублёў, а прывожана на суму 50 мільёнаў рублёў (галоўным чынам прывозілі: соль, селядцы, газу, жалеза, каменны вугаль і інш.). П. Крэчэўскі, як бачым, быў палітыкам з гаспадарственным беларускім розумам. Але ён ня толькі быў палітыкам. П. Крэчэўскі быў так-жа паэтам. І як мне ўдалося даведацца, у Празе ёсьць у прыватных сховах жонкі П. Крэскага шмат ягоных вершаў, якія дасюль нідзе ня былі друкаваныя. З усіх ягоных твораў дасюль пабачыла сьвет толькі некалькі вершаў у названым вышэй зборніку «Замежная Беларусь», падпісаных літарай К. Аб тым, што гэта вершы П. Крэчэўскага, цьвердзіць найбліжэйшы ягоны таварыш, Віцэ-старшыня Рады Бел. Нар. Рэсп., В. Захарка, каторы заняў па сьмерці Крэчэўскага высокі ганаровы беларускі пасад Старшыні Рады Б.Н.Р.

Вершы Крэчэўскага адзначаюцца перад усім глыбокім беларускім патрыётызмам, вострасьцю, верай у лепшую будучыню Беларускага Народу, тугой за родным краем, ад якога быў аддалены апошнія свае гады, а так-жа не малымі мастацкімі прыёмамі. Хацелася-б зараз усё сказанае пацьвердзіць цытатамі, дзеля аднак цэнзуральных абставінаў будзем агранічацца і падамо толькі некалькі характэрных зваротак. І так П. Крэчэўскаму на чужыне ўсьцяж кружылі думкі аб роднай старонцы, што высказаў ён у вершы «Таёмная смага»:

Душна мне. Сэрца калоціць
Ў грудзі, як ў браму ўначы,
Той, што лісты, тэлеграмы
[разносіць.
Спаць не дае, хоць крычы.

Душу мне страх агартае,
Стыне у жылах і кроў...
Сэрца нічога ня знае —
Цягнецца толькі дамоў.

Думаючы аб вестках з роднага краю ў вершы «Рэха» ён кажа:

Калі народ мой адгукнецца
І скажа мне: ідзі сьмялей...
Тады, браты мае, здаецца
І мора пойдзе за гарой.

Разважаючы-ж над кнігай і


трошкі галаву — відаць іх, як на далані. Дастаем, хто што мае ў кішані — грызём. Я меў кусок сухога сыру. Намучыла мяне потым смага. Дзень папаў акурат сонечны, прыгожы. З ночы мы былі зусім мокрыя. Вопратка на сонцы распарылася, кусае за цела, шчыпае. Ледзь дачакаліся мы вечару.

Як толькі сонца спусьцілася на захад, падняліся мы з разоры і сьціраваліся на дарогу. Недалёка сяляне пасьвілі авец. Ад іх мы даведаліся, што граніца ад нас паўтара кілёмэтра і што гэтай дарогай штодзень пад вечар ходзяць пагранічнікі. Папытаўшыся далей пра жыцьцё-быцьцё пайшлі мы ў суседнюю вёску, дзе прабылі, пакуль добра сьцямнела. А там — ноч маці. Прайшоўшы прыгнуўшыся з паўкілёмэтра пачалі мы паўзьці. Як на злосьць, поле хутка кончылася і пачаўся нізкі паплаў-пасьбішча. Пляцоўка пагранічнікаў як на далані. Няма рады, трэба шукаць захіну. На шчасьце знаходзім няглыбокі роў. Вады чуць-чуць. Паўзучы на локцях — вада ня зусім іх залівае. Ноч гэтая здаецца нам вечнасьцяй. Граніцы як ня было. Падвойваем натугі. Зорка сочачы па баках крадзёмся як вужы і раптам плот!... плот!... Значыць граніца.

Пачынае сьвітаць. Мерым даль — мэтраў 100-80. Зрываемся — і ня гледзячы на нічога рвём з усяе сілы наперад. Падбягаем. Плот з калючага дроту. Цягну з кішэні абцугі — тну. Ход вольны.

Па той старане абшар вольны ад лесу. Але там ужо не бяжым, ідзем памалу. Сьвітае на добрае. Углядаемся ў лес, на поле, неба. Хочам адчуць новае. Але што? Пасьля кольцідзеннага напружаньня волі — моцна паслаблі. Думка толькі хоча разгадаць: што нас тут чакае, як выглядае гэтае новае, няведамае. Граніца і труд за намі, таёмнае і страшнае няведамае — перад намі. Ідзём яго пазнаваць, адкрываць.

М. К. П.



дасьледжваючы сваю беларускую гісторыю Крэчэўскі м. ін. пісаў:

Тут дзеі мінулага ходзяць,
Я бачу ў іх продкаў сваіх,
Яны у жыцьцё мяне ўводзяць,
Бароняць ад поступаў злых.

Даюць мне напрамак і сілу
Змагацца за праўду, народ,
Каб мы адыйшоўшы ў магілу
Таксама маглі даць прыплод.

Патрыётызм П. Крэчэўскага быў на гэтулькі высокі, што ён нават сьмерцяй хацеў-бы даваць прыплод свайму народу. І фактычна, Крэчэўскі вытрымаўшы стойка на сваім становішчы даець прыплод новых сілаў беларускаму адраджэньню нават пасьля сваей сьмерці, так як гэта зрабіла стойкая барацьба і мучаніцкая сьмерць Кастуся Каліноўскага. — Крыштальныя гэтыя дзьве гістарычныя постаці зьяўляюцца сымбалямі беларускае стойкасьці.

Я. Н.

„Шляху Моладзі“ ў 10-я ўгодкі яго існаваньня

Дзесяць гадоў існаваньня беларускага часапісу, — гэта нямала знача. За гэты час »Шл. Мол.« вырас, значна разьвіўся і акрэп. Я добра памятаю яго пачаткі, бо і мне давялося дзесяць гадоў таму пабываць на яго »хрэсьбінах.« І сяньня, будучы, не па сваей волі, аддаленым ад Вільні, я з прыемнасьцяй успамінаю тыя хвіліны, хвіліны пачатнай працы гэтага часапісу і супольна з ім сьвяткую яго юбілей.

Вось-жа вітаю „Шлях Моладзі“, выдаўцоў, рэдактароў, супрацоўнікаў і ўсю беларускую моладзь, і жадаю трываць далей пры працы для дабра Беларускага народу.

Пры гэтай нагодзе хачу выказаць усё тое, што я аб „Шл. Моладзі“ думаю.

Прадусім мушу адзначыць той вялікі *ідэалізм,* якім адзначаюцца выдаўцы і рэдактары гэтага часапісу, а без якога на сьвеце ня дзеецца нічога вялікага, праўдзіва паступовага і добрага. Гэты ідэалізм „Шл. Мол.» прадусім кідаецца ў вочы з боку матар'яльнага і ар-



Група супрацоўнікаў «Шляху Моладзі» з вёскі і выдаўцы
Стаяць з лева на права: П. Кайкоўскі, І. Шусьціцкі, Я. Багдановіч, Я. Найдзюк, А. Шутовіч, наймалодшы і пачынаючы паэт Сурвіла, Я. Пітушка і Я. Ляховіч.

Чорнасоценны поп і жонка Леніна

Памёрла ў Маскве нядаўна Надзея Крупская — ўдава першага дыктатара Савецкага Саюзу. Аж 10 выдатных дактароў мусілі падпісаць нейкі там бальшавіцкі акт, пацьвярджаючы, што жонка Леніна памёрла нармальна, як быццам звычайная чалавечая сьмерць перастала ў СССР быць нармальным зьявішчам?

У часе працэсу Каменева, Зіноўева і іншых псэўдонімаў з ліку старых ленінцаў, газэты пісалі, што Н. Крупская недзе нeяк там пратэставала проці суда і расстрэлу іх і была сама за гэта ўзята ў сталінскую апалу. Магчыма! Як зусім магчыма і тое, што пасьля пратэстаў проці сталінскага зьверства трудна цяпер памёрці было нармальнай сьмерцю, у краіне бальшавіцкіх экспэрымэнтаў, нават самой удаве Леніна.

Хочацца падаць да публічнага ведама адзін нікому можа й няведамы дасюль факт, сьведкай якога давялося мне быць у Менску зімою 1919-20 школьн. году. Факт гэты паказвае, што Крупская была здольнай на высокачалавечны паступак, ня гледзячы на сваю бальшавіцкасьць.

Цікавыя нагагул былі перажываньні ў тыя, ня вельмі далёкія, гады „ваеннага камунізму.“ Усяго не апісаў-бы, здаецца, і на валовай скуры.

У 1919-20 школьным годзе я паступіў настаўнікам у 22-ю беларускую школу, у Менску, на Аляксандраўскай вуліцы. Школаю кіравала стараватая ўжо дэвотка-беларуска Г. з беларускай хрысьціянска - дэмакратычнай злучнасьці. Школа-ж была гарадзкою, як і ўсе іншыя школы. Паступіла туды, як былая народная настаўніца і жонка аднаго з нашых „белых“ народных міністраў, калежанка З., але пад сваім дзявочым прозьвішчам; кватэру яна мела сабе ў чорнасоценнага папа С.

Сам я — фармальны дэзэртыр, што не зьяўляўся ў рады чырвонае арміі, ня гледзячы на грозныя прыказы бальшавіцкага ваенкома, абвешчаны бальшавікамі *„вне закона“* за тое, што быў сябрам Рады БНР, — служыў сабе настаўнікам, не скажу каб вельмі спакойна. Ад менскае камісаркі па гарадзкой асьвеце Фрумкінай-Віхманіхі атрымаў разоў пару на пісьме прыказ злажыць ёй дакумэнты датычна мае вайсковай павіннасьці, нічога з

ганізацыйнага гэтага часапісу. Выходзе ён коштам працы: Я. Багдановіча, Я. Найдзюка і А. Шутовіча, якія, будучы друкарамі, урываюць час свайго адпачынку пасьля цяжкой працы і складаюць »Шл. Мол.« Рэшту коштаў пакрывае «Белпрэс» з падпіскі. Адзін-жа з гэтых друкароў, Язэп Найдзюк, знаходзе яшчэ так-жа часу на пісаньне артыкулаў і рэдагаваньне гэтага часапісу. Падчоркваю гэта, каб паказаць, колькі ў Беларусаў ёсьць ідэалізму і сардэчнай любові да сваей роднай беларускай справы. Народ, які мае гэткіх сыноў, ня можа згінуць.

Апрача ідэалізму, які ўкладаюць у выдавецка-рэдакцыйную працу вышэйуспомненыя асобы, належа яшчэ так-жа адзначыць тыя галоўныя прынцыпы, якімі ў сваей працы супрацоўнікі „Шл. Мол." кіруюцца. Прадусім тут трэба адзначыць іх *нацыяналізм*. Яны ў сваей працы кіруюцца беларускім нацыянальным прынцыпам. Аднак нацыяналізм гэны ў «Шляху Мол.» ня ёсьць зоолёгічны, зьвярыны і тоталістычны. Праўда, нацыяналізм гэтага часапісу «тотальны», цалкам абымае беларускую праблему і беларускі народ: *углыбкі* і *ўшыркі* — народны быт, народную псыхіку, культуру, рэлігію, эканоміку, соцыялёгію, гісторыю, географію і палітыку, — але *ўвышкі* гэты нацыяналізм не тотальны, бо ён не замыкаецца ў сабе самым, ня робе з сябе ідала-бажка, мае аткрытыя на сьвет вочы і грудзі, прызнае і шануе нацыянальныя правы і нацыянальныя імкненьні ўсіх іншых народаў, карыстае з іх культурных здабычаў. Гарманійнае сужыцьцё народаў на падставе аб'ектыўнай справядлівасьці і вольны абмен культурнымі вартасьцямі — вось сутнасьць нацыяналізму „Шляху Моладзі."

Другім прынцыпам, на якім „Шл. Мол." апіраецца і ў кірунку якога працуе, — ёсьць *дэмакратызм*. Сутнасьць яго: народаўладзтва і свабода. Аднак, як нацыяналізм, так і дэмакратызм «Шл. Мол.» ня ёсьць тотальным. Тотальны ён *углыбкі і ўшыркі:* абымае ўсе соцыяльныя слаі і ўвесь беларускі народ, але не тотальны *ўвышкі:* права асобы чалавека, сям'і, рэлігіі астаюцца вольнымі і нікому не падпарадкаваны, апрача Божых і агульналюдзкіх прынцыпаў.

Вось-жа гэткім я знаю „Шл. Моладзі" і гэтак я яго разумею. Здаецца гэткім ён ёсьць сапраўды і гэткія ёсьць галоўныя ідэовыя прынцыпы, як выдаўцоў і рэдактароў гэткага часапісу, так і тэй беларускай моладзі, якая даходзе да нацыянальнай сьведамасьці і так ці інакш працуе на беларускай ніве і пашырае беларускую нацыянальную сьведамасьць у шырокіх і глыбокіх пластох Беларускага народу.

ШЛЯХ МОЛАДЗІ

(Акроверш)

На 10-я ўгодкі часапісу «Шлях Моладзі»

Шлях народны *к лепшай долі*
Л*ёг праз нашае жыцьцё...*
Я*рка сьвеціць зорка долі,*
Х*оць навокал сумна ўсё.*

М*оладзь! Дружна! У дарогу!*
О*хі з сэрца выкідай...*
Л*ева-права — ўсе у ногу,*
А *па зорцы той раўняй!*
Д*ружна, моладзь! На работу...*
З*ло з карэньнем вырываць*
І *для долі шчасьця ўзьлёту*
Шлях народны *расшыраць!*

УЛАД-ІНІЦКІ

Здаецца мне так-жа, што гэныя прынцыпы, якіх трымаецца „Шл. Моладзі», аб якіх я тут у некалькіх славах успомніў, зьяўляюцца прынцыпамі правільнымі і вядуць беларускую моладзь да лепшай, сьветлай будучыні.

Яшчэ раз шчыра вітаю «Шл. Моладзі» з яго юбілеем, вітаю ўсіх яго супрацоўнікаў і чытачоў і жадаю, каб у хуткім часе гэты часапіс яшчэ больш разросься і разьвіўся і каб згуртаваў каля сябе ўсю беларускую моладзь, — гэтую маладую гвардыю, якая давяла-б Беларускі народ у вялікую сям'ю культурных і цывілізаваных народаў!...

Ад. Станкевіч

Слонім, 6.III 1939 г.

гэтага не рабіў, бо, як былі афіцэр, рызыкаваў галавою, аднак у бальшавіцкіх вайсковых уладаў не рэстраваўся. Праўда, што цяжка было перажываць „тыдзень дэзэртыраў," калі кожнаму дакляравалася дараваньне кары (праўдзівей кажучы, жыцьця!), калі ён пакіне ўхіляцца ад вайсковай павіннасьці і ў працягу 8-х ці 9-ёх дзён зарэеструецца, ня тоячы свайго былага званьня ў расейскай арміі. Але пражыў я неяк і тыдзень дэзэртыраў, ходзячы на працу ў школе штодзень акуратна.

Прашу мне выбачыць за гэткую спраўку аб сабе і пераходжу да расказу пра чорнасоценнага папа, пра налёт на яго кватэру чэкістых, арышт і г. д.

Быў дзень, калі калежанка З. на службу ня прыйшла. Кіраўніца школы дала мне яе адрэс і папрасіла даведацца, ці не захварэла часам наша ціхая, сымпатычная калежанка і добрая настаўніца.

Зьявіўшыся ў кватэру папа С., застаў я там зьбялеўшыя насьмерць дзьве жанчыны: калежанку З. і „матушку" С.— папову жонку, значыцца. Па ўсёй кватэры быццам швэды прайшлі. Параскіданыя на падлозе паперы, кнігі, парцё, вопратка, падушкі і пер'е з іх – усё сьведчыла, што нехта тут няпрошаны пагаспадарыў.

Матушка паказалася мне раптам пасівеўшаю, а калежанка З. пастарэўшаю гадоў на дзесяць. Яна не магла аддыхацца і на прывітаньне маё ня мела сілы ўсьмяхнуцца. Слабым перарывістым голасам гаварыць пачала можа праз паўгадзіны. А я ўсё паўтараў, пытаючыся, з магчыма ласкаваю ўсьмешкай:

— Што гэта ўсё значыць? Што тут было ў вас?...

Першаю загаварыла матушка.

Трасьлі ўсю ноч чэкістыя. Мужа арыштавалі. Калі раніцай пайшла у ЦК, пытаючыся, ці жывы яшчэ муж яе, дык сказалі там, што ён адасланы ў Маскву.

— Я звар'яцею, ня вытрываю, — хапалася за галаву матушка, — я нават маліцца ўжо згубіла здольнасьць.

Чым я мог пацешыць няшчасную, старую жанчыну?

Тымчасам язык пачаў служыць і калежанцы З.

— Найгорш тое, — ціхенька казала яна,—што бацюшкаў білет сябра „союза русскаго народа" знайшлі... Да вурадніцкай вайсковай вопраткі мужа майго ўчапіліся. Шынель ды яшчэ тое-

Паўлюк Трус

(у дзесятыя ўгодкі сьмерці песьняра).

Сёлета мінае дзесяць год ад сьмерці выдатнага беларускага паэта Паўлюка Труса. Паэт памёр ад цяжкой хваробы брушнога тыфусу, у цьвеце веку, бо меў усяго толькі 25 гадоў, памёр у пару, калі ягоны талент пачаў буйнець і асягаць штораз большыя паэтыцкія магчымасьці.

Кароткі жыцьцёвы шлях паэта прадстаўляецца наступна: радзіўся ў беднай сялянскай сям'і ў вёсцы Нізок, Менскага павету; тут-жа атрымаў пачатковую асьвету; далей вучыўся ў сямілетняй школе ў мястэчку Вузда; прадаўжаў адукацыю ў Менскім Беларускім Пэдагогічным Тэхнікуме (1923—1927), па сканчэньні якога працаваў у рэдакцыі газэты „Палеская Праўда" (Гомель); у 1928 г. пачаў здабываць вышэйшую асьвету ўступіўшы ў Менску на пэдагогічны факультэт Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту.

У кароткім сваім жыцьці адзначаўся паэт бязупыннай працай над сабой і на грамадзкай і літаратурнай ніве.

Трус быў актыўным сябрам многіх грамадзкіх арганізацыяў, сталым, энэргічным супрацоўнікам розных газэт. Амаль усе пэрыядычныя выданьні Менску (газэты: „Беларуская вёска", „Савецкая Беларусь", „Зьвязда", „Беларускі Піонэр", „Малады Араты", „Полымя", „Маладняк") зьмяшчалі прадукт працы ягонай творчай душы.



Паўлюк Трус

Свае першыя спробы пяра пачаў зьмяшчаць сыстэматычна ў насьценнай газэце Беларускага Пэдагогічнага Тэхнікуму, а ад 1924 г. пачаў друкаваць свае вершы ў пэрыядычных выданьнях.

Пры жыцьці паэта выйшлі асобнымі выданьнямі два зборнікі яго лірычных вершаў: *„Вершы"*, Менск 1925 г. і *„Ветры буйныя"*, Менск, 1927 г., па сьмерці — *„Выбраныя вершы"*, Менск, 1931 г., а ў 1934 г. акадэмічнае выданьне—абшырны том *„Збору твораў"* П. Труса, Менск, Выдавецтва Беларускай Акадэміі Навук, у якім зьмешчана значная частка літаратурнае спадчыны песьняра.

Тэматыка творства, ідэолёгічнае накіраваньне і амаль усе мастацкія сродкі Паўлюка Труса характарызуюць яго, як тыповага беларускага сялянскага песьняра.

Малюнкі беларускага жыцьця, поэтызацыя сялянскай гаспадарскай працы, вобразы барацьбы за гаспадарчы і культурны дабрабыт вёскі, беларускія вясковыя пэйзажы, асабістыя інтымныя перажываньні, апраўленыя ў рамкі вясковага пэйзажу або сялянскага быту, а з гэтых перажываньняў першым чынам лірыка каханьня—вось галоўныя тэматычныя заінтэрэсаваньні Паўлюка Труса. Беларускі вясковасялянскі элемэнт выпаўняе сабою амаль усё творства песьняра, — лірычныя вершы, мастацкія паэмы і публіцыстыку ў вершах.

Міма таго, што пясьняр жыў, вучыўся і працаваў у савецкіх варунках, гдзе абавязывае камуністычная ідэолёгія, яго творства пранітавана іншай ідэолёгіяй. А ў тых творах, у якіх выражаны рэвалюцыйныя матывы, ён далёкі ад правільнага разуменьня палітычна-сацыяльных праблемаў у духу камуністычнае ідэолёгіі.

Самое зьявішча рэвалюцыі паэт разумее пасвойму, — як

сёе забралі, дапытваючыся, чыё гэта? Я адказала, што брата майго, няведама дзе згінуўшага...

— Ну, вы ў школу не сьпяшайцеся! - казаў я калежанцы,— хай нэрвы крыху ў парадак прыйдуць.

— Ой, ня ведаю, ці змагу я цяпер нават праз які тыдзень за працу ўзяцца! — адказала яна.

Матушка павяла мяне па ўсіх пакоях даволі вялікае кватэры свае, дзе ўсё было перакулена дагары нагамі.

Адзін толькі салідны, даволі тоўсты, у машастовай вокладцы, альбом важна ляжаў на стале гасьціннага пакою, быццам нікім незакрануты.

— Дзіўна! — сказаў я голасна, падыходзячы да гэтага альбому, — лахманы розныя папёрлі, а гэтае рэчы, як быццам і ня бачылі...

— Ага! — перабіла мяне матушка,—ведаеце, хто тут ёсьць?... Мадам Леніна... мы разам вучыліся з ёю калісь... вось гэта я, а гэта—яна, Надзенька Крупская,— паказала на адну з картак альбому, быццам павесялеўшая раптам, матушка...

На старой фатаграфічнай картачцы пабачыў я вясёленькія тварыкі дзьвёх расейскіх шкалярак...

— Эўрыка! — гукнуў я, каб разагнаць забойчы настрой калежанкі З. і разьбітай горам матушкі.

І пачаў радзіць, як ратаваць арыштаванага ўночы папа.

Пісаць у Маскву, прыпомніць Крупскай далёкія шкалярскія гады, можа нават картачку гэтую ёй паслаць. Пісаць не як бальшавіцкай саноўніцы, а так, як калісь, як той 14 ці 15-гадовай Надзі, пайсьці да старшыні менскіх народных камісараў (Мясьнікова, ці як звалі яго йначай— Мясьнікянца) і патрэбаваць, каб пісьмо зараз жа было пераслана ў Маскву Н. Крупскай...

Радзіў я ўсё гэта так сабе, каб чым-небудзь пацешыць няшчасную жанчыну, бо зусім ня верыў, каб што памагло яе мужу.

Матушка села пісаць пісьмо. Я разьвітаўся з ёю і з калежанкай З. і вярнуўся ў школу...

Трудна апісаць маё зьдзіўленьне, калі на 4-ты ці на 5-ты дзень пасьля гэтага зьявілася ў школу зусім паздаравеўшая наша калежанка З. і, перадаючы мне падзяку ад матушкі С., сказала, што яе муж—ведамы ўсяму Менску чорнасоценец — вярнуўся з Масквы жывым і здаровым.

Краўцоў Макар

праяву стыхійных, бунтарскіх сілаў. Вось чаму, нпр. падаваныя паэтам абразы розных стыхійных праяваў у прыродзе (буры, навальніцы, разьліў ракі падчас паводкі) зьяўляюцца сымбалямі рэвалюцыі. — Насупроць бальшавіцкай навукі і практыкі, паэт не тасуе клясавага падыходу да беларускае вёскі і ўсяго Краю. Беларусь у яго без клясавай дыфэрэнцыяцыі і без клясавай барацьбы. Побач з гэтым, жывым акордам б'ець з ягоных твораў сялянскі індывідуалізм, ідэалізацыя ўласнасьці і апяваньне індывідуальнай, апёртай на сыстэме хутароў, гаспадаркі. (Тады, калі пісаў Трус, асабліва ў першых гадох яго літаратурнай працы, праводзілася ў Савецкай Беларусі ў практыку новая эканамічная палітыка (НЭП), на вёсцы адбываўся працэс хутарызацыі). Апроч таго, насупроць бальшавіцкай навукі, у Паўлюка Труса, міма ягонага бязбожніцтва і агітацыі ў творчасьці супроць рэлігіі і духавенства, знаходзім элемэнты ідэалістычнага сьветапагляду і містыцызму.

Савецкая крытыка вуснамі прафэсара Піотуховіча (зьліквідаванага маскоўска - камуністычнымі ўладамі ў 1937 г. за беларускую „нацдэмаўшчыну"), характарызуючы ідэовы бок творства Паўлюка Труса раньняга пэрыяду (1924—1927 г. г.), так гавора аб паэце: „Паўлюк Трус нёс у сабе ўвесь груз сялянскай абмежаванасьці (чытай: беларускіх сялянскіх элемэнтаў — Я. Ш.) увесь цяжар дробна-буржуазнага (чытай: ідэалістычнага — Я. Ш.) сьветапагляду... Паўлюк Трус у падыходзе да сацыяльнай рэчаіснасьці, у сваім творчым мэтодзе ня мог узвысіцца над паверхоўнай эмпірыкай і схэматыкай. Паэт усьпявае кастрычнік (кастрычніцкую рэвалюцыю — Я. Ш.), але ён прымае яго на грунце вузкага эмпірычнага дасьведчаньня; ён нядзольны раскрыць рухаючых сіл пралетарскай рэвалюцыі, пазнаць яе ва ўсёй супярэчнасьці і складанасьці клясавай барацьбы. Пралетарыят і камуністычная партыя... роля гораду амаль зусім не ўваходзяць у поле яго зроку"... (Праф. М. Піотуховіч: —*„Да характарыстыкі літаратурнай спадчыны П. Труса"* — *„Збор твораў П. Труса,"* Менск, 1934 г., бач. 13).

І ў пазьнейшым пэрыядзе творства паэта, з выняткам некаторых інтэрнацыянальных і камсамольскіх абстракцыйных фразаў, мае такі самы характар.

Паўлюк Трус у вельмі малым ліку твораў сваю ліру настрайвае на камуністычны тон, — надта мала маем твораў, дзе выражана пралетарская ідэолёгія, пры гэтым ў іх пралетарскія матывы пераплятаюцца з матывамі беларускага патрыётызму. Беларускі патрыётызм — гэта аснаўны тон лірыкі песьняра і ўсей ягонай творчасьці. Паэт безгранічна любіць Беларусь, родны край, беларускую вёску, прыроду.

Ён ставіць сабе за заданьне:

зьдзейсьніць мэту
і золата дум
падарыць на карысьць Беларусі
(*верш „Брату"*)

Ён дэкляруе:

...душой гарэць
ў бурным моры жыцьця
Беларусі дарыць свае песьні
(*„З студэнцкага дзеньніка"*)

а так-жа ўсё аддаць:

за агняцьветы-зоры
за любы, родны край,
так сэрцу дарагі
(*„Ізноў я там"*)

Глыбака сялянскі паэт, Паўлюк Трус даў беларускай мастацкай літаратуры патрыётычныя творы—народныя ня толькі па духу, паводле свайго зьместу, яны народныя і з боку фармальнага. У шырокай ступені ў творчасьці сваей паэт скарыстаў з беларускага народнага фольклёру, з рознастайных стылістычных сродкаў народнай творчасьці.

Асабліва да ўспадобы паэту беларуская сялянская песьня:

Эх,
песьня, песьня!
Я... ніколі
цябе забыцца не магу!
Ты смутна-ціхім тонам болю,—
ў палёх бяскрайніх твой разгул.
Ў палёх
шырокіх твае тоны,
былынёг
дзе ўецца па гары,
дзе цінай тканыя загоны
купае сонца на жвіры.
(*З паэмы „Сірата Алеся"*).

І яму ўдаецца перадаць тоны і рытміку гэтай песьні.

У нікаторых вершах ён зусім беспасрэдна стылізуе фальклёр, бяручы з яго і тэматыку і слоўна-мастацкія сродкі. —

Нелітасьцівая сьмерць забрала беларускай літаратуры і народу маладога ўталентаванага, вельмі творчага і плоднага песьняра, які ў працу кароткага часу, бо толькі ў працягу 5 гадоў, значна ўзбагаціў скарбы беларускага мастацкага слова і культуры.

Я. Ш.

Вясновая песьня

Гляну праз акенца
Я на прыгуменца,
Гляну у прывольле
На шырока поле.
Вясна-красна на дварэ.

Пад гарой пакатай
Малады Араты,
Сын сярмяжнай вёскі,
Мерна йдзе палоскай.
Вясна-красна на дварэ...

Гэй, буланы конік,
Заіржы сягоньня,
Будзь вясны вясёлкай
У полі на пасёлку.
Вясна-красна на дварэ.

Узару, пасею
Да й забараную, —
Буйнае насеньне
Хай расьце, красуе.
Вясна-красна на дварэ.

Няхай наша песьня
Коціцца прадвесьнем
Новым адгалоскам
Над кужэльнай вёскай.
Вясна-красна на ўвесь сьвет.

Песьня адгукнецца
У цішы даліны,
На грудзях краіны
Морам разальлецца.
Вясна-красна на ўвесь сьвет.

Гляну праз акенца
Я на прыгуменца
І пайду ў прывольле,
Дзе калосіць воля.
Вясна-красна на ўвесь сьвет.

Паўлюк Трус